Беларускае мастацтва

Д-р ІПЭЛЬ.

БЕЛАРУСКАЕ МАСТАЦТВА

(D-r A. IPPEL. ZUR WEISS-RUTHENISCHEN KUNST).



ПЕРАКЛАД З НЯМЕЦКАЕ МОВЫ
З. ГАРБАЎЦА і М. КАСЬПЯРОВІЧА

ВІЦЕБСК 1925

Уполглавлитбел № 6064.
Тип. «Коминтерн» Витполиграфпрома. Зак. № 1626—1600 экз

БЕЛАРУСКАЕ МАСТАЦТВА

Гэта выданьне надрукована у ліку 1000 экз., з якіх 100 экз. нумарованых на лепшай паперы.

Прадмова перакладчыкау *).

Доугі час Беларусь не магла карыстацца сваймі сувэрэннымі правамі. Гэта перашкаджала мецць свае вышэйшыя навуковыя установы і усебакова дасьледаваць свой прастор, прыроду, мастацтва і д. п., тварыць свае бытаваньне. А калі й было якое-колечы зьбіраньне матарыялаў і распрацоука іх нашымі суседзямі, дык з вядомага вялікадзяржаунага пункту погляду — самауладзтва, праваслауе, велікаруская народнасьць, або усяпольская ідэя, каталіцтва і г. д.

Калі Вешацель пасьля прыдушэньня беларускага паустаньня 1863 году пачаў

*) Нажаль у Віцебскіх друкарнях яшчэ няма „ў“ нескладовага і „ё“.

рассылаць па Беларусі розныя „навуковыя“ экспэдыцыі, каб давесьці, што Беларусь спрадвеку заходні „истинно-русский край“, былі пасланы й мастакі з мэтаю вынікамі сваіх досьледау давесьці, што беларускаго мастацтва таксама ня было. Але мастак Струкаў зрабіу зарысоўкі грамадзянскага і культавога, (касьцельнага, царкоунага, сынагогальнага) беларускага мастацтва больш менш об‘ектыуна. Зразумела, што ў яго зарысоўках ні Вешацель, ні яго прысьпешнікі не знайшлі нічога „истинно-русского“. Альбом Струкова быу закінены і толькі значна пазьней адшуканы Е. Р. Раманавым.

Раманаў напісау працу аб альбоме Струкава („Зап. Сев.-Зап. От. Имп. Рус. Геогр. О-ва“ т. 3), а таксама у аднэй з сваіх другіх працаў („Старина доисторическая Сев.-Зап. края“) закрануў найстарадаунія курганавыя помнікі беларускага мастацтва.

A далей было шмат працаў з паказанага намі пункту пагляду, бадай што да апошняга часу. Часамі, як, напрыклад, проф. Паўлуцкім у вядомым выданьні Грабара („История русского искусства“, вып. 8) беларускія помнікі мастацтва адносіліся да ўкраінскіх.

Цікавасьць да беларускага мастацтва нарастае асабліва ў канцы 19 сталецьця і пачатку 20. Аб помніках беларускага мастацтва гавораць: Паўлінаў у „Древних храмах Витебска и Полоцка“ і „Истории русской архитектуры“, Іодкоўскі у „Древностях“, зьмяшчаючы там працы; „Церкви, приспособленные к обороне в Литве и Литовской Руси“ і „Замок в Мире“, а таксама Кандакоў і Таўстой у „Русских древностях“ і інш. Гэтыя аутары ўжо патроху разглядаюць нашы помнікі з спэцыяльна гістарычна-мастацкага, а ня толькі археолегічнага боку.

Ды й самі беларусы аднавілі першапачатковую працу зьбіраньня і вывучэньня беларускага мастацтва. Вядомы беларускі культурны дзеяч Іван Луцкевіч наладзіў у Вільні ў 1913 годзе цікавую выстаўку сучаснага беларускага народнага мастацтва. Апрача таго, ён сабраў найкаштоўныя зборы мастацкіх рэчаў беларускае старасьветчыны.

З цягам часу Беларусь перажыла разам з іншымі народамі панаваньне царскага самаўладзтва. Пашла ў нябыцьце Кераншчына. З Берасьцейскаю згодаю нямецкая акупацыя апанавала Беларусь. У працівагу панаваньню расійскага самаўладзтва ў мірных абставінах, немцы з штыхом у руках рабілі вялікую культурную працу па дасьледаваньню прыроды, быту, эканомікі, шляхаў зносін і да таго падобнага. У гэтым кірунку вялікая Беларусь прадстаўляла амаль што непачаты прастор.

Па ініцыятыве Івана Луцкевіча сыстэматычна і плянава над беларускім мастацтвам у часе акупацыі працавалі дактары: Іпэль і Гайгалат і профэсары. Швіндрацгейм і Вэбэр з 10 арміі. Пры дапамозе Луцкевіча Іпэлем былі арганізаваны дзьве выстаукі беларускага мастацтва—у Менску і у Вільні. Да іх Іпэлем супольна з Луцкевічам былі уложаны два каталегі з каштоунымі увагамі у тэксьце. У гэты час Луцкевічам быу зьмешчаны у газэце 10 арміі артыкул аб беларускім мастацтве. Апрача таго, як вынік дасьледаваньня, зьбіраньня й вывучэньня нямецкімі вучонымі беларускага мастацтва засталіся іх працы, выданыя 10 арміяй: Вэбэра аб Вільні, Гайгалата и Швіндрацгейма аб літоускіх мастацкіх помніках і Іпэля артыкул аб беларускім мастацтве, які мы й падаем тутака у перакладзе на беларускую мову.

Артыкул Іпэля мае бясспрэчна вялізарнае выключнае значэньне, як першы, што асьвятляе беларускае мастацтва ад яго пачатку ў сувязі з месцам яго разьвіцьця й рознымі ўплывамі на яго. Затым ен павінен быць крыніцаю, адкуль можна чарпаць перешапачатковыя веды аб розных галінах беларускага мастацтва.

Артыкул, бязумоўна не прэтэндуе на вычарпанасьць і скончанасьць, ня ставіць сабе мэтаю дасьледаваць дасканала ўсе галіны беларускага мастацтва, іх гісторыю. Ен зьяўляецца вынікам нядоўгай працы Іпэля, які сам кажа, што далей патрэбна падрабязнае, дакладнае дасьледаваньне, што й высьветліць канчаткова гісторыю беларускага мастацтва, а таксама ўнясе шмат каштоўнага ў гісторыю агульнага мастацтва.

Зусім слушна Іпэль паказвае, што польскае мастацтва ні ў якую эпоху

не рабіла ўплыву на беларускае. Нам вядома з гісторыі, што польскае мастацтва заўседы пераймала ад каго хаця, і ніколі ня было кіруючым у разьвіцьці мастацтва, апрача аднаго выпадку ўплыву Матэйкі на „передвижников“, адыграўшага значную ролю ў заняпадзе малярства на тэрыторыі былой Расіі.

Наступным дасьледчыкам беларускага мастацтва прыдзецца дэталёва распрацаваць бегла зачэпленыя Іпэлем пытаньні і ўлажыць у іх конкрэтны зьмест, як, напрыклад, пытаньне беларускага малярства ў Польшчы, аб гравюрах, якія адыгралі значную ролю ня толькі ў Беларусі, але і для ўсяе тэрыторыі былой Расіі і г. д. Зусім не зачэплена Іпэлем існаваньне аднача сна некалькіх школ гравюры, што відаць з ілюстрацыяў да артыкулу. А яны маюць значэньне нават і для сучаснага разьвіцьця мастацтва, Аб‘ём-

ная трактоўка аб'ектаў на плошчы, монумэнтальная пабудова фігураў, ня гледзячы на невялікую велічыню ўтвараюць уражаньне помнікаў у прасторы. А у другім адменьніку—зусім плоскасная трактоўка фігураў, іншае разьвязаньне прастору і г. д.

Але усе-ж, як мы ужо казалі, цяперака, у адноуленай працы дасьледаваньня беларускага мастацтва й яго разьвіцьця, артыкул Іпэля будзе карысным, як для шырокіх колау грамадзянства, так і для дасьледчыкаў.

М. Касьпяровіч.

З. Гарбавец.

Віцебск 1.2.25.

Беларускае мастацтва.

Лёс беларускае краіны быу зауседы цяжкім. Як стары дзяржауны мост паміж вадзяным прасторам і дрыгвянымі балотамі, яшчэ ад першабытнага гістарычнага часу яна зьяулялася абарончым месцам гульні Арэса. З часаў старадаўніх норманскіх князеў, што аваладалі краінаю дрыгвічоў у 9 і 10 сталецьцях, тутака, паміж Кіевам, Менскам і Полацкам аж да часоў Напалявона лютавала барацьба. І ў апошнюю вайну застаецца такі самы малюнак—прыліў туды й сюды, з усходу на захад, ваенных гушчаў з усімі жахлівымі вынікамі, руйнаваньнем і спусташэньнем. Тутака ня было трунту для захаваньня рэштак старасьветчыны,

дзе-б маглі усталяявацца мастацтва й культура. Яны прадстаўляліся самі сабе. Калі, напрыклад, у багаты кругабег гісторыі Менску за першыя 500 гадоу захаваліся цэлых два паданьні, аднауляючыя стан, у якім знаходзіліся мастацкія і архіўныя рэшткі старасьветчыны краіны, асьветленыя ў выстарчаючай меры, — дык адно некаторыя мясцовасьці даюць нам жывы абраз працякаушай высокай культуры краіны, што здолела утварыць гэта. Выстаука беларускага мастацтва ў Менску ў 1918 годзе ўсе-ж паказвае, што пры дакладным дасьледаваньні можа знайсьціся шмат выдатных старых мясцовых мастацкіх твораў.

Каштоуным, прыродным музэем беларускага мастацтва зьяуляецца аддаленае глухое невялічкае места Слуцак на паўночным усходзе ад Менску. Розныя прычыны захавалі ў гэтым месьце стара-




Ікона.

жытнасьці незачэпленнымі. Значным зьяуляецца тое, што ўладары краю--князі Алелькі й Радзівілы на ўладу праваслаунае царквы не пасягалі, а вуніяты ў тых краёх мелі зусім невялічкі уплыў польскае каталіцкае царквы. Тры старых найвыдатных драуляных царквы 15 сталецьця зьдзіуляюць мецэнатаў мастацтва, адведаушых гэтыя малюнкі места. Адна з іх, Юраўская царква, што захавала яшчэ й цяперака свой стары іконастас, рэзаны і расьпісаны мясцовымі мастакамі, галоўным чынам, у яе надзвычайнай аздобленасьці, у яе прыемнай гармоніі, зьяулеяцца красою усіх беларускіх цэркваў. Са сказанага відаць, што ў Слуцку можна знайсьці творы старой беларускай маляўнічай школы, якіх, зразумела, у цяперашні час у кніжках па гісторыі мастацтва яшчэ ня знайдзеш. Найстарадаўнія весткі аб гэтай школе

знаходзяцца ў надпісу аднаго твору 15 веку ў Кракаўскім саборы, які кажа, што мастакі места Вільні выканалі гэты твор па загаду ўладара Казіміра Ягайлавіча. Прыгожы абраз Мадонны на Востраў Браме ў месьце Вільні есьць таксама твор, што адпавядае старой беларускай школе. Слуцкія цэрквы захоўваюць разнавобразныя малюнкі 17 і 18 сталецьцяў.

Іншыя добрыя мастацкія творы сабраны ў Магілеўскім храме-музэі, галоўным чынам, зьбіральнікам дарэктарам Строганавым. Тамака зьмешчана множ прыгожых беларускіх старажытнасьцяў, выратаваных ад гібелі. Зьдзіўляе, што ва ўсіх гэтых творах нязначны ўплыў візантыйска-расійскае школы. Кідаецца ў вочы сувязь з нямецкім мастацтвам, што добра перадавалася цераз Балтыку. Асабліва гэта засьведчываюць сярэбрана-выбіўныя працы. Дзьве вялікіх ся-

рэбраных плашчаніцы Магілеўскае брацкае царквы азначаюць, нават без над-



Рог дывана.

пісу, што беларус Ваўчок, як мастак, блізкі да данцыгскіх працаў. Абраз Міхаля ў храме-музэі таксама гэта сьведчыць.

Надзіва добра напісана данцыгская сярэбраная марка на мячы арханела!)

Зусім сваеасаблівы Слуцкія сярэбраныя тканіны. Тульпаны й васількі — іх пераважны матыў. Каштоуныя старыя бармы і дыядэмы з уладаньняу Алелькаў зьяўляюцца аздобаю ў Слуцкай Тройцкай царкве

Малярства міньятураў было ў стане значнага росквіту: амулеты, нацельнікі былі прадстаўлены ў шмат якіх селах. Амаль што кожная вёска мела манаполію на аднаго азначанага сьвятога. Другая веска аналегічнага вобразу маляваць не магла. Ксілеграфія ў высокім і нізкім мастацтве шмат практыкавалася. Аб гэтым сьведчаць шмат дабраватых гравюраў у старых кнігах. Асабліва гэта прадстаулена ў вядомых беларускіх біблiях. Паасобныя часткова высока — мастацкія антымінсы або абразы

ў праваслаўнай царкве ўтвараюць інтэгральны малюнак. Народ да сяго часу ўжывае ксілеграфію для друкаваньня на сваіх палотнах раскошных узораў (крашаніна).

Беларускае народнае мастацтва, так сама як літоўскае, прызвана яшчэ раз адыграць значную ролю ў гісторыі мастацтва. Але няхай будзе коратка азначана ў якой сувязі. Паказаныя краіны ўтвараюць мяжу паміж усходам і заходам на поўначы Эўропы. Першабытна — значны Дняпроўскі шлях нёс апошні ўплыў візантыйскага і старагрэцкага мастацтва ў іх. Бясспрэчна мы



Абразок.

яшчэ раз знаходзім тутака асноўныя формы грэцкага тэатру і грэцкіх храмаў ў акрэсьленых гаспадарчых будовах, як, напрыклад, у надворных сялянскіх будынках у Рагачоўскім павеце, што збудаваны па пляну і узору элінска-рамонскіх вілаў. Вядомыя беларуска-літоўскія крыжы ні ў якім выпадку ня знойдзены тутака. Нам вядомы такія самыя формы, напісаныя на антычных фрэсках. Як звычайна, форма старадаўня-паганскага культу малярства былі тутака хрысьціянізаваны. Так званыя наміткі й пасакі прэемственна бяруць свой пачатак ад грэцкае тэніі. Ці ня дзіва, што беларуская сялянка, таучэ свае крупы па сеняшні дзень таукачамі, аднакімі па формах з тымі, якія у пятым сталецьці перад нараджэньнем Хрыста мы знаходзім на адным малюнку Палігнота ў руках траянскіх жанчын



Гравюра.

калі яны абараняюцца ад грэкаў? (Wgl; S. 31).

Паміж іншым, у 18 сталецьці мы знаходзім на тэрыторыі Беларусі дзьве надзвычайных вытворчасьці сусьветнае значнасьці — Слуцкія паясныя фабрыкі і Урэчынскія шкляныя заводы Трэба сказаць, што ў абедзьвюх фабрыках аб «польскім» мастацтве ня можа быць ніякай гутаркі. Кіраўнік і галоўны мастак паяснoе фабрыкі Леў Маджарскі, прыраджоны вэнгр, будучы ў турэцкім палоне навучыўся тканьню паясоў і прыгожым візантыйскім узорам. (Паміж іншым, ен дзед «польскага» кампазытара Манюшкі). У Урэччы працавалі амаль што толькі нямецкія майстры і падмайстры — Вахстрэм, Каўфэль, Флеск і інш.

Беларусь яшчэ хавае у сабе шмат невядомых каштоўнасьцяў, што маюць

больш чым гістарычнае значэньне. Прыдзе час, калі аб іх будуць гаварыць.
Гэта будзе тады, калі прыдзе
час для самой Беларусі.


B00000002482721